# Вобразы думак

# Вобразы думак

Плён IV Агульнапольскага конкурсу
беларускай паэзіі і прозы

Беласток 1999

Падборка тэкстаў
Віталь Луба

Карэктура
Міраслава Лукша

Камп’ютэрны набор
Яўгенія Палоцкая

Тэхнічная апрацоўка
Аляксандр Максімюк

Спонсарамі IV Агульнапольскага
конкурсу беларускай паэзіі і прозы былі:
Міністэрства нацыянальнай адукацыі
Управа горада Беластока
Міністэрства культуры і мастацтва
Фонд імя Стэфана Баторыя

ISBN 83-911514-1-7

*Publikacja sponsorowana*
*przez UrzN№d Miejski w Biaiymstoku*

Copyright © 1999 by Беларускі саюз у РП
& Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”

Выдавец
Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”

Друкарня
„Offset-Print”, ul. Broniewskiego 14, Biaiystok

# *Вучнёўская творчасць*

# Жанэта РОЛЯ

* * *

Гранатавым сяйвом крывавіць настольнік
Вушка кубка дрэмле ў фарфоравым сне
Затопленая ў салодкім моры ўспамінаў
Чакаю: канца... новага пачатку.





* * *

Мары танцуюць у такт тваіх веек.
Позіркі растапляюцца ў шэлесце слоў.
Думкі стаяць у чаканні пяшчоты тваіх праменняў.
Спалоханая — хачу,
магу...
уцякаю.

## Дарастанне

З’яўляюся чаканнем
магутнасці гуку
зялёнасці вясны
соладу неба

Чакаю
ветру
крыку
жаху

Чакаю
зразумення
паху кахання
канца свету.



*Вучнёўская творчасць*

# Анэта ГАЛІМСКАЯ

## Многа любові

Мой любімы,
Мой сябра,
Мая радзіма,
Бацькаўшчына.
Мая маці,
Мой бацька
Кахаюць мяне.
Я таксама
Хачу сказаць:
Кахаю.

## Жыццё

Жыццё маё,
Жыццё тваё.
Жыццёвы шлях
У кожнага з нас.
Жыццё доўгае,
здаецца,
а яно — кароткае.
Каханне —
адна радасць у жыцці.
Каханне старэйшых
і каханне маладых.
Чалавек марыць
Кахаць.
Марыць аб жыцці
і жыць
для мары, кахання, любові.



Вучнёўская творчасць

## Люблю...

Люблю марыць аб любові,
Люблю сніць аб мары,
Люблю прачынацца рана,
Люблю засынаць вечарам,
Люблю хадзіць у школу,
Люблю сяброваk і сяброў,
Люблю сваё жыццё,
Хаця не ведае ніхто,
Калі скончыцца яно...

# Мажэна ЖМЕНЬКА

* * *

Згубленая...
Жамчужына на дне акіяна долі
Замкнутая ў клетцы боязі
Уцякае перад светам у глыб сябе
Дзесьці далёка...
У гушчары цішы шукае кроплі надзеі
І не можа яе знайсці
Як белая картка сярод тысячы кніг
Схопленая вадаспадам мар
Не зможа дакрануцца да зямлі





* * *

На сцежках жыцця, на скрыжаванні дарог
Шукаюць украдзенага шчасця
Не знойдзенага кахання...
Праз пабітае акно глядзяць на свет
Выкінутыя словы
Страчаныя дні, месяцы, гады...
Шукаюць вымытага дажджом сэнсу існавання
Праўды замкнутай у падвалах хлусні
Ідучы сцежкамі асалоды
Забыліся пра жыццё
Цяпер у адзіноце і глухім маўчанні чакаюць
прабачэння
Рабы граху...

# Змяніць свет

Паплывуць дрэнныя думкі
Адыдуць кашмары
Адляцяць людскія сэрцы
А мы, загубленыя ў сабе
сядзем у карабель надзеі
І адляцім далёка...
Украдзем рознакаляровыя воблакі
Засвецім усе зоры
І лабірынтам жалю
Дойдзем да брам раю



*Вучнёўская творчасць*

# Вочы

Па шчацэ паплыла апошняя сляза
Наступная кропля роспачы
І ўтапілася ў акіяне жалю
Загінула як цень
Без вяртання
Па другой старане люстра слёз
Пабачыла яго вочы
Чорныя, таямнічыя...
Якія авалодалі яе душой
І адабралі найбольш каштоўны камень свету
Жыццё...

# Адрыян ЛУКША

## Зіма

Прыляцела з ветрам
халодная Белая Дама.
Прынесла белага пуху
На радасць усім дзецям.

Прыйдуць Каляды,
Новы год прыбяжыць.
Мы каля ёлкі
наладзім карагод!





# Рафал ЛУКША

## Начная прыгода

Цёмна. Вяртаюся з горада дадому. Іду з апошняга цягніка цераз лес. Чую гук самалёта. Выходжу на поле і гляджу ў неба. Свецяць месяц і зоркі.

Раптам адна зорка ляціць да Зямлі. Перада мною стае вялікі жоўты дом на курыных нагах. Ад страху не магу зрабіць ні кроку. Адчыняюцца дзверы і выходзяць два высачэзныя мужчыны. Яны лысыя, вочы свецяць як дзве вялікія бульбіны, без носа, замест рота — вузкая дзірачка.

— Мы прыляцелі з Марса. Хочам разрэзаць табе жывот і паглядзець, ці ўсё ўнутры здаровае, — гавораць і адразу хапаюць мяне за рукі.

Крычу і стараюся ім вырвацца. Не магу. Тады штурхаю іх нагою ў лыткі. Марсіяне падаюць.

— Вось што ім баліць, — думаю.

Уцякаю. Яны гоняць мяне і крычаць: „Не ўцячэш ад нас! Мы зараз зловім цябе, як рыбу ў сетку!”

Накідаюць на мяне сетку. Стараюся вырвацца, шарпаюся і шарпаюся. Яны смяюцца. Шарпануўшы з усяе сілы паляцеў я невядома куды і ўдарыўся моцна плячыма. Усюды цёмна. Няма ні зорак, ні месяца, ні марсіян. Паўзу і мацаю, дзе я апынуўся. Урэшце ўбачыў маленькае святло. Падпоўз туды. Памалу ўстаў і прыглядаюся, а гэта акно ў маім пакоі! А бадай яго! Які кашмар мне прысніўся!





# Барбара ТРАФІМЮК

* * *

Хмара чорная з градам
над вёскай бушуе,
а дзіця ў садочку
плача ды сумуе.
Бедна сіраціна
вярнулася з поля,
але не дадому,
ах доля ты, доля.

# Кацярына ЯРАШЭВІЧ

*Творчасць моладзі*

## Словы

Як рэха разносяцца,
па свеце плывуць,
прадвяшчаюць добрыя навіны,
жаль людзям нясуць.
Умеюць забіць
самыя скрытыя мары чалавека
і аздаравіць
            яго душу.
Словы — магія свету.

# Альжбета НЕГЯРЭВІЧ

* * *

падэшвы размоў пра існаванне
прамоклі
пад скалай заўтрашняга паветра
дык параскідалі мы думкі
і схавалі твары свае
у ананімных гарадах нашых далоняў

куды, скажы
куды плыве гэтая споведзь
гэтае дзіця пасівелага спакою
з разбітым каленам

ляжыш на сонцы, сябар мой,
на самай ускраіне памяці
ці ты стаў на калені перад маім святым
вар'яцтвам
калі я зашчапнула за табой павекі
і сон прыйшоў
сон
як паэзія





* * *

цяпер, калі загубленая ноч
разбілася аб зямлю, яшчэ цёплая
і мяккая як дзіця
крывавіць рэшткамі ўяўлення
цяпер
здаецца вырасла я, бо
паменшаў мне свет і свежую смерць надзявае
на маладое цела
асоўваецца па сходах маіх думак
у сладастрасныя плечы голай паперы
цяпер
чарніла кончыцца
апакаліпсіс аўтаручкі
так мала важна
дык свет канчаецца
безупынна

* * *

Дзве кварты, з якіх праліваю
кроў кожнага слова.

Імглою адыходжу
ступаючы па цемры.

А ты, цішыня
пакуль перарасцеш мяне
пі гэтую кроў
праклята.

Дзве кварты, з якіх праліла я
цішыню.
Адну ў зямлю — твой мёртвы свет
якім накармлю цень
гэтага цёплага яшчэ крыку.
У ім — другая кварта
— заржавелая надзея.





## Малітва

каб ужо ніколі
не маліцца да сябе
пра цярплівасць
і крыху шчасця
Божа

## Юрка БУЙНЮК

# Вечар за вёскай

За вёскай неба разгарэлася
    гарачай галавенькай
аранжавы апельсін сонца
хіліўся на захад
    чэрвеньскага вечаровага дня
неба прызмай колераў дагарала
плылі аблокі з царкоўных ікон
і яны хіліліся ў казачнай пярыне
    да пахучых лугоў
да старых лясоў
    бы бабулькі старыя
ў паклоне зямельцы перад сном
    казку чароўную шаптала
на лузе трава ў пакосах засынаючая
    рытмічна іграў жабін аркестр
рэха яго ішло пад лес
    у вадзе мачыў ногі бусел
    птах беларусаў
заслуханы задумлены
ў нябесную казку
    поўную колераў святых
і малітвы



Творчасць моладзі

* * *

*І. К.*

Шукаю голасу твайго
сярод галасоў дзяўчат
Шукаю твару твайго
сярод твараў красунь
Шукаю думак тваіх
сярод думак уласных

Маю надзею што
твае твар думкі голас
знайду
сярод нашай сустрэчы

## Сабаку

ты мне руку сваю даеш
а маю руку ліжаш пяшчотна
твае цёмныя вочы
сустракаюць мой позірк

разумееш маю мову
мілы сябра
за гэта табе падарунак
мараў тваіх — костка





# Юстына КАРАЛЬКО

* * *

я — жанчына без твару
крылом матылька гнаная
ударам хвалі мытая
песнямі памерлых суцешаная
сяду ля тваіх ног
замянюся ў што захочаш
толькі дазволь мне пасля памерці

* * *

у агні тушу слёзы
выпальваю цёмныя плямы
на карце дня
не гладжу слоў
— пакалечыла рукі





## бабуля

клямкай рысак на паперы
спудзіла застылую зелень дзён
у стомленым дыханні хвілін
сяджу
лічачы
маршчыны сухіх кветак

## цені на вадзе

сівы волас
упаў на парус часу
веерам танца
утаймую чорную занавеску
расчашу імглу
рэхам старых казак





* * *

гром ночы тузае запыленыя струны
рассыпаліся засушаныя слёзы
забыццё прыйшло на заваяванне памяці
— як добра што гэта не ты

# Барбара БІРЫЛКА

## Пакута

Бываюць такія дні,
калі ўсё хачу пакінуць,
пайсці ў белы свет
і ніколі не вярнуцца.
Пайсці ў свет
і як дзіця заплакаць,
ужо ніколі не адчуваць болю
і ніколі не кахаць.





* * *

Чую крык людзей,
Бягу ім з дапамогай,
Бягу, бягу, але нікога не відаць.
А можа гэта крычу я? Не!
Не, гэта не я.
А можа гэта мая душа?

# Люцына ДАНІЛЮК

* * *

Глянь!
Кветка
Яна расце — жыве
Таксама як мы
Кахае яна
Кахае сонца і дождж
Без іх — памірае
Аднак калісьці зноў зацвіце
Зацвіце і пакахае
Так як цяпер...





* * *

У цішыні... ціхай ночы
У яснасці... яснага дня
У празрыстасці... празрыстай
вады
У зялёнасці... зялёнага лесу
— Мае адносіны да свету.

# Мая ДАЦЭВІЧ

## Еду

Еду сабе проста ўдаль,
па дарозе мінаю дрэвы,
гляджу праз акно
на прыгожую вясну,
але і так...
ад жалю сэрца сціскаецца.
Не ўмею цешыцца
прыгажосцю прыроды.
Не ўмею глядзець
на прачынаючыся свет
і адчуваю сябе
быццам сэрца мне хтосьці ўкраў.
Вецярок дзьме, птушкі спяваюць,
... не, я не смяюся,
слёзы маю душу заліваюць.
Патапіліся ў іх
мае мары,
мая радасць жыцця
і мэта майго існавання...





## * * *

І зноў ідзе дождж.
І зноў сяджу,
але не ведаю дзе.
І думаю,
і не ведаю аб чым.
І гляджу праз акно
на дождж.
І плачу, плачу,
дзе ты, дзе!?!
І зноў гляджу,
цябе няма.
Не было цябе ранкам,
ані вечарам,
не было цэлы дзень.
Ну, што маю рабіць...
... так моцна кахаю цябе...

## Барбара КАЗІМЯРУК

### Малітва

Падаю на калені
перад Табою
закрываю твар
саромеючыся слёз
глянь на мяне
ласкавым вокам
малю Цябе!
чуеш малітвы мае?
Твая воля
а жаданні мае
я ж прашу толькі
дай, Божа!
крышачку шчасця ў любові.





### Праміnанне

бягуць секунды, мінуты, гадзіны,
дні і ночы, тыдні і гады
жыццё бязвольна праходзіць
з цяжарам турбот, пустых абяцанняў.
ныраю ў нябыт
кругом шэрасць, туманы.
вось мае аблічча
страх, сум, разарэнне
люстраны вобраз маіх думак.

## Ілона КАРПЮК

# Мы адыходзім!

Вёскі паміраюць,
Мы спаглядаем на гэта здалёку.
У гомане сённяшняй цывілізацыі
Забываем
Пра нашых продкаў,
Пра нашы карані.
Калі ж прабудзімся з глыбокага сну?
Пэўна будзе запозна,
Сустрэнем толькі драўляныя крыжы...



*Творчасць моладзі*

* * *

Яшчэ ёсць сапраўдныя беларусы:
Мастакі, патрыёты.
Яны пастаянна верацць...
Ваююць словам, песняй, творам.
Апякуюцца сваёй маладой Бярозкай.
Настойліва, непахісна
Бароняць сваё шчасце.

# Анеля КЕНДЫСЬ

## Вясна

Зямля паказала румянае аблічча.
Кветкамі аздобіла яшчэ
дзявочае цела,
пясочнымі грудзьмі пачала
карміць сваіх дзяцей.
А я ляжу на яе мяккай далоні
пад дрэвам,
гляджу ў неба
і бачу вясну
над сабою,
каля сябе
і ў сэрцы.





* * *

Здараецца, што іду лугам,
гляджу ў неба,
а ў хмарах бачу твой твар.
Ты глядзіш на мяне вачыма,
у якіх апрача кахання
я ўбачыла дзве зоркі.
Яны сняцца мне ўначы —
я скрываю іх у гарачых далонях.
А там вось лес пачынаецца.
Хто там стаіць?
Ты?
Мае ногі шукаюць мяккай імглы,
каб панесці сябе ў твае абняцці.
А можа гэта не тваё аблічча
там, сярод блакіту
Можа гэта смерць
глядзіць на мяне белымі вачыма.

# Ірына КУЛІК

* * *

Плачуць думкі
На ўспамін
Тваіх прыхільных вачэй
Што датыкаюць мой твар
Ветлівым святлом кахання...
Тужыць душа
Калі аддаляешся нечакана
Пакідаючы спакой
Што напаўняе прастору
Зычлівай ласкай любові...
Трывожыцца сэрца
Ад бязмежнай радасці
Якую ўліваеш у пасудзіну
Штодзённай вокладкі
Празрыстага жыцця...





* * *

Адкрываю павекі
Ледзяной усмешкі
Датыкаю пастаянна
Ахвяру людской цемры
Засынаю на моры
Неахопных уздыханняў
Шукаю прагна
Магілу здраднай адзіноты...

# Агнешка ЛЯШУК

## Ты

Ты паказаў мне
зоркі на небе
ноччу
з Табою першы раз
цешылася я
усходам сонца
з Табою я пазнала
смак першых
пяшчот
Да Цябе плывуць
мае наймілейшыя
ўспаміны
Але ты мне гэта ўсё
забраў, адным словам
і жэстам
Цяпер маё жыццё чорна-белае
Нічога мяне не цешыць — усё смуціць
Без Цябе жыццё маё бязвартаснае.





## Слёзы

Плывуць з вачэй
як дождж,
калі мы сумныя
... тады яны горкія.
Але бываюць,
хаця рэдка,
слёзы радасці.
Яны — самая асалода,
імі можна жыць.
Дождж — гэта таксама слёзы.
Ці нехта прабаваў іх некалі?
Я — так.
Яны горкія, таму што сумныя,
таму што нехта плача
над намі
ў небе.

# Іаанна МАСАЙЛА

## Гэта яны

баяцца свайго адбітку ў люстры
кланяюцца ценям
— смешныя людзі
у зачараваным кругу
перад зачыненай брамай
чакаюць
— бедныя людзі

гэта яны —
праходзяць незаўважна
шэрыя дні
выпаўняюць сабой
без усмешкі
без скаргі
— гэта яны





* * *

усё, што чалавечае
вядомае нам
гаворым
упэўненыя як дзеці

людзі — браты
гаворым
а скачам брату
да горла

раздзяляем усмешку
пазычаем добрае слова
абдароўваем нянавісцю

пасля...
пасля ідзём да неба

# Ірына РАДЗІВАНЮК

* * *

Шукай, а знойдзеш,
Слухай, а пачуеш,
Глядзі, а ўбачыш —
Мой плач у гэтай гулкай цішыні.





## Могілкі

Я прыкуты адзінотай
да свайго месца, якога няма.
У маім жыцці толькі свет,
да якога ўцякаю...

Пераходзячы цераз вароты адвечнага сну
поўнага сілы, спакою,
дзе жах кладзецца на імху,
дзе вочы след у след за табою...

Усё тут апусцелае
апрача крыжоў і гары мудрасці.
Усё тут здаецца малым,
калі ўбачыш веліч свайго бяссілля.

Дрэвы чуюць дыханне свабоды,
Цераз голле глядзяць на месяц,
кідаюць цені ў яснай цемры,
аддзяляючы сябе ад свету.

У чырвоных блясках гарачых агнёў,
у свеце вобразаў белых супакояў
Краіна тваёй абароны.
Тут лічацца словы і іх значэнне.

# Івона РАЕЦКАЯ

* * *

Знайсці канец,
увайсці ў марскія хвалі
і там астацца,
танцаваць ноччу,
падняцца да зор...
Гэтага не патраплю.



*Творчасць моладзі*

## Вясёлка

Мост для Анёлаў,
злучае Неба і Зямлю.
Па ім сыходзяць
Анёлы да нас.
Чаму мы па вясёлцы
не можам
увайсці да Анёлаў?

# Анна САДОЎСКАЯ

* * *

Воск
сцякае і застывае
мёртвы.
Салодкім пахам
капае ў ложак
на якім
я
сплю.





* * *

Дотык багацея
перамяніў мяне ў шкло
малое, крохкае.
Ад адной слязы
яно рассыплецца

# Івона ЧУРАК

* * *

Адкрываю жылы
Выпускаю кроў
Белая скура ўступае ёй з дарогі
Залівае свет сваёй пурпурай
Цяпер не будзе ўжо ён такі шэры

* * *

Я трымала вакол сябе
Паміраныя светы
Увайшла ў свой сон
Мне прысніліся
    Людзі



# *Творчасць дарослых*

# Рэната БІЛЬМІН

* * *

Калі сон не прыходзіць

прыгадваю твае цёплыя далоні
хаваю ў іх
свае думкі

даглядай іх





* * *

вецер засынае
і сонца
прычыніла вочы
месяц абуджаны песняю салаўя
выйшаў на шпацыр
я не баюся
гэта лісце дрыжыць

* * *

Забіваю кожную думку
        пра цябе
                пакуль яна набудзе колер тваіх вачэй

Хачу забыць
        тваё імя
                пакуль пачну паўтараць яго праз сон

Гуляю ў вайну са сваім шчасцем





* * *

Не кранаеш маіх далоняў
        Не памятаеш маіх вуснаў
Губляеш хвіліны шчасця
        на ростані дарог
Абымаеш рукамі пустату
        учарашняга дня
Забываеш мяне слова за словам

# Івона МАРЦІНОВІЧ

* * *

сказалі сёння...
лепш несціся нікуды з вачыма вар’яцкімі
і памятаць пра тое што ў пекле пабачыш
чым пытаць калі і як наведае нас рай
              не веру
пра гэта вышэй і ніжэй я тлумачу
на вуснах — маленне аб цудзе... і з цуду
     у белай імлге спаткаеш

тое





* * *

стаяў ахінуты смуткам
     з расой на вачах
і белаю рукою
              моўчкі
гладзіў сацін пасцелі халоднай
              праўды
                       якой
дух стаміўся вечны
     стаміўся нашым грэхам
                       панурым
              цяжкім
ад якога адхінаюцца хмары
     пярун шалее ў асколках сябе

а Ён шкадаваў хвіліны марнай...
               жыцця людскога

* * *

са слязою... і страхам
пры доўгім
              цьмяным святле ліхтароў
тэлеграмы дрыжаць у тонкіх пальцах
     чакаеш суцехі ад жыцця?
     і яно часам пэўнасць губляе
але паступаюць абрысы надзеі
     з папяровымі крыламі
крыламі распасцертымі боскім танцам
шчасця
     мары нязбытнай і...

таму аб вечнасці сёння мовім





* * *

колькі патрапіла мне пад руку...
              пад павеку
              вусны мае
і ўсё ж душа імкнецца да падарожжа
у якім не няволяць думкі
     а чалавек чалавека
              адчуць здольны
мне лёгка і дзіўна шчасна
бо дом мой у сэрцы круціцца
     як падарожжа каруселі

# Анеля МІСЯЮК

*майму каханню — Томку*

* * *

не ўмею кахаць людзей
цэлым сэрцам
Божа мой, даруй мне
грэшнай
не ўмею прабачыць шчыра ворагам
за ўчыненыя крыўды
Божа мой, даруй мне
грэшнай
не ўмею прасіць з пакорай
за прабачэнне він
Божа мой, даруй мне
грэшнай
але кахаю Цябе Божа
над усё на свеце
Божа мой, даруй мне
грэшнай
маю пыху





* * *

люстраное адбіццё ўказвае
пачвару
сладастрасны чын высысае
яд смерці
каб забіць
прападае заслона прыстойнасці
у паўсвятло цень роспачы
расплываецца па сценах
душа ўцякае ў падзямелле
Гадэса
на вечны спакой
заглушаны енкам
фальшывай цягі

* * *

частка мяне памірае
з штогадовай адлігай жыцця
пачуцці разрываюць стомленую
душу
у шыбе апырсканай
брудам свету
бачу адбіццё асобы
якая прайграла сваё жыццё
чаму яшчэ дыхаю
бруджу паветра людзям
жадаючым шчасця





# Зінаіда ЛУКША-КАВАЛЕВІЧ

## Каронны сведка

Я нарадзіўся ў вялікім горадзе Беластоку ў пана Алега. Ён забраў мяне ад мае мамы Азы і завёз у вёску пад пушчай. Даў мяне Алёне ў вялікае яе свята — матуру, казалі. Алёна ведала і цыганскую мову, таму і назвала мяне проста „Сыга” — сабака. Я быў маленькі цюцік, і падабалася мне быць з Алёнай. Спадабаўся мне таксама Юрка; я быў згодны, каб яна мяне забрала да яго. Было тады многа людзей, пахла смачным, грымела музыка, а Алёна матляла белай доўгай сукенкай на дроце, што не было як да яе падысці. Паехалі мы жыць у другую вёску, за лесам.

Не пазнала б мяне мая маленькая мама, такі я вырас дужы! Усе сабакі абыходзілі мяне далёка, а сучкі проста млелі — не трэба было мне нават выбягаць з вялікага падворка. Воля! Трава па пояс, наўкол лугі, пушча! Занятку шмат. А тут і дзеткі паявіліся, занятак яшчэ які ціка-

вы! Важная справа — выхоўваць дзяцей. Яны такія добрыя былі, пяшчотныя — і мая Алёна, і Юрка, патыхаючы горкай махоркай, і пахучыя малаком Ева і Тамаш. А яшчэ дзед з бабуляй, яна больш крыклівая, але добрая, кашу мне варыла са скваркамі. Дом вялікі будавалі мужыкі незнаёмыя, і Юрка, і дзядзька Генік, і суседзі, што мяне крыху баяліся — хапіла гыркнуць, каб парадак быў. Я быў шчаслівы з імі — маёй Алёнай, Юркам і малечамі.

Цяпер мне муляе ў шыю ланцуг пад шопкай у бабулі Ганусі. Добра, што хоць маю дах над галавой. Ды чаму ж шопку не абабілі дошкамі, як тую хату. Летам — як на патэльні, зімой мерзну ў вушы, качанеюць лапы. Дошак не хапіла? Усё ж баба Ганууся насіла іх сюды, тыя смольныя дошкі, у шопку. Тады, як дзеда Жэніка ўжо не было, а Юрка стаў пахнуць смерцю. Праз дзіркі ад вуліцы бачу, як мая Алёна едзе з мястэчка, мінае наш новы дом, імчыцца роварам далей. Чаму яна мяне не хоча абняць, як калісь, не дасць пацалаваць свае рукі? Юрку і дзеда Жэніка вывезлі ў драўляных скрынях, закапалі за мястэчкам, сам бачыў дзе, хадзіў я туды не раз, пакуль мяне не ўвязалі. Плакаў і выў я, і тады, і сёння, але хто мяне паслухае. Часам, здаецца, ходзіць па падворку дзед Жэнік, прыбівае штыкеты да плота. Чую яго дух, старанне, ды няма яго, і Юркі няма. І Алёны няма. Не можа, напэўна, прыйсці, не пускаюць. Можа, і яе на ланцугу трымаюць? Ева і Тамаш забягуць да мяне пад вечар, пахнуць чужымі дзецьмі і паперай, даюць мне свае бутэрброды. З сырам, з маслам. Салоныя. Гаркавыя. Зусім як мая сабачая сляза.

Часам сам ужо не ведаю, што мне рабіць. Плакаць не выпадае — кормяць, пояць. Ну, не адвязвае мяне бабуля. Адна баіцца жыць. Я — вялікі, дужы яшчэ, мяне баяцца. Я пільную хату, падворак. Наш падворак. Якая наша бабуля важная — мяне ўвязала для сябе, а я ж не хацеў быў пакідаць і Алёну. Як жа ёй, маёй Алёне, без мяне? Хто яе абароніць? Пабег бы, пабачыў у суседнюю вёску, ды што, сарвацца?.. А што з домам?

Вось і зноў нейкія прыязджаюць. Адны пахнуць Варшавай, другія атрамантам. Не бачыў я тут іх, як гэты дом ставілі, як вазілі дрэвы, рэзалі дошкі. Ведаю ўсіх тых, хто памагаў, заўсёды ім лапу падам. А гэтых, з мовай крыклівай, што на Алёну лаюцца, брэшуць — разарваў бы на кавалкі! Ды непрыгожа — я ж такі парадачны пажылы сабака.

## Пара

— Калі ласка, калі ласка,
Прыедзь ты да мяне, Параска.
— Не скажу це, ці прыеду,
Мой ты стары мілы дзеду!

— Ну, прыедзь жа ты да мене!
Буду я таўчы каменне.
Пабудуем сабе хату
Высоку й шыракавату.

А як сабе пашлюбуем,
То таго не пашкадуем.
Мы кахацца будзем вечна,
Хоць у наш узрост то небяспечна!

Такая вось з нас пара,
Як з старога самавара!
То няпраўда, што без смаку
Жыццё старых небаракаў!





## Думкі ў дарозе

Колькі можна ўжо рабіць!
Мо пара ўжо адпачыць?
Часу для жыцця нямнога...
Што рабіць з сябе дурнога?
Трошкі часу маю, давай скарыстаю,
Не пасплю ў дарозе да роднага краю,
Запішу тры словы на белай паперы
Для памяці ў людзях, надзеі і веры.

# Аліна ГАПУНОВІЧ

* * *

*І. В.*

У вузкай далоні
Трымаеш карты.
Ашукаць хочаш
Свой лёс упарты?

Ужо досыць доўга
Ты лічыш страты,
А клён зялёны
Стукае ў краты.

Ты ўжо на волі.
Ці засталося
Штось апроч болю
На гэту восень?





* * *

На месячнай поўні
затрымаўся час.
Дождж метэарытаў
зляцеў на месячны
мой горад.

Векавечных募раў
адкрыты ўжо сэнс.
Трымаю ў жмені
месячны пыл.

Селенанаўты прысылаюць
вынікі даследаў.
Бязважкасць і радыяцыя —
іх сябры.
Месячныя карты — наш
хлеб надзённы.

Месяц нам ужо вядомы.
Селенанаўты ствараюць
новыя базы.
Наперад! Пазнаем касмічны
свет!

Месячны пыл
свеціць на маёй далоні,
неспазнанай.

# Славамір КУЛІК

* * *

па маёй душы
ходзяць цені
цені продкаў
дрэнна апранутыя
спрацаваныя
не зайздрошчу
ім лёсу
зайздрошчу шэпту
іх мовы





* * *

распусціла валасы
самотная бяроза
падаравала ёй
жыватворныя сокі вясна
стала прыгажэйшай
чым яе сяброўка трава
вецер пачасаў
пацешыў у самоце
убачыла ў сонцы
дзе яе спадарожніца жыве
ужо ведала, што бярозаў
на свеце хоць дзве

Ірына ЛУКША

## Звычайны дзень

Хтось памёр
Плача яго сям'я
Як штодзень
Едуць самаходы
Спяшаюцца людзі
Дзеці бягуць у школу.





## Мая дарога

Іду сваёй дарогай
Іду толькі раз
Больш ёю ісці
Ніколі не буду
Што бачыла дасюль
Бачыць больш не буду
Нічога не здарыцца
Больш як адзін раз
Маланкай ляціць час
Гоніць мяне да неба
Прыгнятае да зямлі
Адыду ў іншы
Можа лепшы свет

## Сапраўднае каханне

Быў сонечны летні дзень. У парку было шмат людзей. Найбольш было маладых закаханых пар.

Закаханыя хадзілі абнятыя, трымаліся за рукі, сядзелі на лаўках і, пяшчотна тулячыся да сябе, аб чымсьці гаварылі, часта смяяліся.

Сярод маладых вылучалася адна пара: высокі і прыгожы хлопец ды нізкая, непрыгожая дзяўчына, якая моцна кульгала. „Або яна вельмі шчаслівая, або гэты прыгажун вельмі нешчаслівы”, — гаварылі жанчыны, мінаючы іх.

Раптам павеяў халодны вецер, загрымела і пачаў ісці дождж. Людзі беглі з парку дадому.

Хлопец з калекай дзяўчынай таксама рушылі. Юнак зняў пінжак і накрыў плечы дзяўчыны.

— Бяжы хутчэй, — прасіла дзяўчына, — ты прамерзнеш. Я сама пайду.

— Не, — рашуча сказаў хлопец, — я цябе кахаю і не пакіну адну на дажджы. Мне цёпла ад твайго кахання.





# Мікалай ЛУК’ЯНЮК

## Дубы

На ўзгорку пры дарозе
Там стаялі два дубы
Між сабою гаманілі
Дзе сястрычку ім знайсці.

Кажа дуб свайму брату:
„Глянь улева, падзівісь,
Там у даліне пры лужочку
Гай зялёненькі стаіць.

То сястрычкі там, бярозкі,
Між сабою гутараць
Вецер іх галлё калыша
Нам нічога не чуваць.

Трэба нам ім пакланіцца,
Нізка галаву схіліць
Ды паслухаць што гавораць
І з імі пагутарыць”.

А бярозкі ўсе, сястрычкі,
Разважалі пра вясну,
Шчыра разам весяліліся,
Што зялёненькі яны.

А дубочкі, два браточкі,
Надалей сабе стаяць
Як дзве мілыя сіроткі
Між сабою гутараць.

Тут прахожы ішоў дарогай,
Сеў пад дубам адпачыць
І паслухаць аб чым шумяць
Ды з імі пагаварыць.

А дубы яму сказалі:
„Ты, прахожы, не тужы,
З крыніцы напіся вадзіцы
Ды далей сабе ідзі".





# Гора

Пайшло маё гора
У шыроку дарогу,
Цераз тое гора
Я маю трывогу.

Дзе б я не паехаў,
Услед за мною гора.
Не магу яго пакінуць
І бяру з сабою.

Замкнуў сваё гора
Я ў роднай хаце
Паехаў за воду,
Каб шчасця шукаці.

І там за вадою
Напаткаў я гора.
Яно яшчэ болей
Было мне ліхое.

Захацеў я гора
Абы-куды прадаці,
А яно схавалась
У маёй роднай хаце.

Так жыву я з горам,
Увесь век страдаю,
Хаця мая хата
Ёсць у вёсцы
з краю.





# Марыя МАНАХОВІЧ

## Жаўранак

Ледзьве днее, ледзь світае,
птушка шэра як зямелька
над палямі ўзлятае.
То ляціць у паднябессі,
то на момант замірае,
то як шэры камень з неба
зноў на зямлю ападае.
Ад світання да змяркання
на хвілінку не змаўкае,
на зямлю шле сваю песню,
заліваецца, спявае.

## Лес зімою

Лес прыгожы сам сабою,
а цудоўны ён зімою.
Усе травы, усе былінкі,
усіх дрэў усе галінкі
іскрацца ў сонечных праменнях.
Зіхацяць як зор мільёны,
быццам у казцы лес чароўны.
Голкі сосен зелянеюць,
а там пні сасонак рдзеюць.
Гнуцца елачак галінкі
пад пушыстаю пярынкай.
Усюды чыста, свежа-бела,
снежныя пушынкі
ўсё прыкрылі: лясы, пушчы,
дарогі, сцяжынкі.





# Мікалай ПАНФІЛЮК

## Рэчка Арлянка

Рэчка Арлянка,
Цябе перагарадзілі,
Зрабілі вадасховішча.
Так улады „абсудзілі”.

Каля „Бахматаў”
Тут амаль курорт,
Улетку з’язджаюцца людзі
У маленькі „порт”.

Але ты ляціш далей
З сваёй вадой чыстай.
Нават бабры палюбілі
Твае тоні празрыстыя.

Ты выцякаеш з крыніц,
Што на вярху і ў зямлі
Багата на Елянскіх лугах.
Паклон і пашану ад мяне прымі.

Ці ты багатая рыбай?
Аднак паявіліся ракі.
Многа мы, людзі, прычынілі табе шкоды
Як эгаісты, самахвалы і небаракі.

Ты плывеш нягледзячы на перашкоды
І то буйна і скора
Зліваешся з другімі рэкамі, вадаёмамі
І канец твой: стыхійнае мора.





# Жарывец

Мой родны кут — Жарывец:
Лугі, сенажаці,
Равы, лясок, кусты;
Трэба ўсё любіць, як і знаці.

Калісьці тут было яшчэ прыгажэй:
Рай птушак і рэдкіх раслін,
Балота-дрыгва, што не прайсці,
А колькі было парэчак, лілій ды малін...

Што ж, Жарывец асушылі,
Бо так мо было трэба?
Пасеялі высакаякасную траву
Каб жыць было лягчэй і „бліжай” да хлеба.

Але і сёння,
Гэта ўрочышча чаруе, бо гэта наш край,
Выдае сена багата і плённа
І для птушак, звяркоў няхай будзе рай.

Гэта дубіцкая тэрыторыя —
За вёскай, дзе сонца ўзыходзіць
Люблю і шаную старонку.
Здаецца, што і старасць да мяне не прыходзіць.

# Ніна ПАЦЭВІЧ

## Добры ўчынак

Мы з мамай сядзелі ў акопе, які падрыхтаваў нам бацька. Бацька мой, як і іншыя мужчыны, з каровамі і коньмі быў у лесе, хаваючыся такім чынам ад немцаў. Раніцай прыносіў ён нам малако. У хаце засталася мая любімая кошка з трыма малымі кацянятамі, якіх я кожны дзень паіла малаком. Калі мама сказала, што пойдзе дамоў па ежу, я выплакала, каб забрала мяне з сабой. Узялі мы малако для кацянят і пайшлі. У вёсцы было вельмі ціха і страшна. Дайшлі мы да хаты. Мама ключом адчыніла дзверы, у каморы ўрэзала кавалак сала, пазбірала ў куратніку яйкі і мы паволі пачалі выходзіць з панадворка.

У той час штосьці загудзела. Глянулі мы на дарогу і ўбачылі нямецкую танкетку. У ёй было чатырох немцаў у чорных эсэсаўскіх мундзірах. Убачыўшы нас, павярнулі яны на грэблю і заехалі на наш панадворак.





Адзін з немцаў падышоў да маёй мамы і спытаў па-польску, што яна мае ў фартушку. Мама паказала змесціва і тады ён папрасіў спячы яешню з дзесяці яек.

Мама адчыніла дзверы, мяне паслала да дрывотніка па хвораст. Сама выняла патэльню, нарэзала сала і разбіла дзесяць яек.

Хвораст хуценька гарэў, яешня мігам была гатовая.

Нямчуры селі пры стале, з-за халявы выцягнулі лыжкі, другі прынёс хлеб з танкеткі. Вельмі хутка ўсё апаражнілі. Задаволеныя выйшлі на панадворак. Выйшлі і мы з мамай. Немец падышоў да яе, палажыў сваю руку на плячо і сказаў: „Gut mutter” ды пацалаваў маму ў шчаку.

Наша вёска Аўгустова гарэла з боку Бельска. Яе падпалілі немцы.

— Глядзі, твая вёска ўжо гарыць, таму мы і прыехалі сюды, — сказаў немец. — Дзякуючы, аднак, тваёй дабраце яна выратуецца! Мы яе пакінем.

Калі немцы ад’ехалі, мая мама крыху ажыла. Напаілі мы малаком кацянят і пайшлі ў поле, дзе чакаў нас бацька, знерваваны нашай доўгай адсутнасцю.

Адзін добры ўчынак выратаваў нас ад смерці, а нашу палову вёскі — ад пажару.

# Марк РУБАШЭЎСКІ

## Дождж

Калі пачынае ісці дождж,
Стаю ля акна.
Шыбы плачуць.
Залатыя слёзы па іх плывуць
— слёзы дажджу.

Адкуль?
Можа гэта Бог плача над грэшным народам?

... Не! Адкуль жа!
Гэта залатыя хмары,
калі вецер вее,
адчыняюць свае вароты
і спускаюць дождж на зямлю.





* * *

Гаворым: каханне,
але самі не ведаем, што гэта значыць.
Гавару: у кахання горкі смак.
Яны: каханне — гэта прыгажосць,
толькі трэба за яго змагацца.
Той, хто палохаецца,
не спазнае смаку.
Гаворыш: баюся!
Чаго?
Што не атрымаецца?
Можа?
Але гэтую таямніцу Бог сцеражэ.
Думаю, што трэба спрабаваць і даць з сябе
ўсё.
Гавораць: Кіруй сваім сэрцам,
яно табе заўсёды паможа.
І выбярэ ўсё найлепшае.
Сэрца — гэта бясцэнны дар...
... ад Бога.
Сэрца калечыць.
але дазваляе кахаць.

# Уладзімір САЎЧУК

## Гутарка вясны

Вада плыве спакойна
між скальнымі зубамі
яе ніхто не гоніць
ні днём ні вечарамі

Я вырасла высока
жаўток цяпла і веры
вясну нясу ў калысцы
— вы адчыняйце дзверы...

...Яшчэ адну гадзінку
нам сонейка пагрэй
— Вясна вось-вось за лугам! —
ціўкоча верабей

За гай дрымучы
у краіну募раў
нясу свае паслугі
на талерцы чараў





* * *

Ты абяцала мне
што прыйдзеш

а цішыня прадзе каханне
і сумна месяц пазяхае

на даляглядзе цішыні
чужыя думкі плятуць зоркі
на кроснах

а я як белая бяроза
стаю маўчу

а цішыня прадзе каханне

# Анна ЯКАНЮК

## Крыллі

На гэтым небе няма хмар.
Неба само банальна сіняе.
На гэтым небе няма крат.
Людзі з усмешкамі шчаслівымі.
Так 25 гадоў падрад.
Новае лісце на галінах...
А паляцець нельга ніяк,
Быццам падрэзаў нехта крыллі
Мне піскам голых птушанят.
Пад намі міны, могуць выбухнуць.





## Нясмеласць па-сучаснаму

Мне да Цябе далёка, так далёка...
Сузор’е Андрамеды нат бліжэй...
Калі ў Космас запушчу я вока,
Напэўна там не вылаўлю Цябе.
Бо адначасна блізка, вельмі блізка...
Адлегласць да Цябе — пара мінут,
Дарога роўная, нават не слізкая,
Ды ведаю: напэўна не пайду.
Усё гэта няведамая сіла
Адной рукой кіруе да Цябе,
Ды адначасна, неяк так труслівa
Другой рукой трымае за каўнер.
Ну бо і што Табе скажу я, хлопча?
Што я не вырашу Тваіх праблем,
Ты беспрацоўны і я беспрацоўная
Калі нам плакаць — лепш кожны сабе.
Што выйдзе з гэтага? Будзь тут прарокам.
Бо шанцы ёсць, што выйдзе яно так:
Той вынік будзе раўнадзейнай
І да мяне ты проста прыйдзеш сам.
І што тады Табе скажу я...?

# Змест

## *Вучнёўская творчасць*

***Жанэта РОЛЯ***
*Гранатавым сяйвом крывавіць настольнік* ........ 6
*Мары танцуюць у такт тваіх веек* ........ 7
Дарастанне ........ 8
***Анэта ГАЛІМСКАЯ***
Многа любові ........ 9
Жыццё ........ 10
Люблю... ........ 11
***Мажэна ЖМЕНЬКА***
*Згубленая...* ........ 12
*На сцежках жыцця, на скрыжаванні дарог* ........ 13
Змяніць свет ........ 14
Вочы ........ 15
***Адрыян ЛУКША***
Зіма ........ 16
***Рафал ЛУКША***
Начная прыгода ........ 17
***Барбара ТРАФІМЮК***
*Хмара чорная з градам* ........ 19
***Кацярына ЯРАШЭВІЧ***
Словы ........ 20





***Альжбета НЕГЯРЭВІЧ***
*падэшвы размоў пра існаванне* ........ 22
*цяпер, калі загубленая ноч* ........ 23
*Дзве кварты, з якіх праліваю* ........ 24
Малітва ........ 25
***Юрка БУЙНЮК***
Вечар за вёскай ........ 26
*Шукаю голасу твайго* ........ 27
Сабаку ........ 28
***Юстына КАРАЛЬКО***
*я — жанчына без твару* ........ 29
*у агні тушу слёзы* ........ 30
бабуля ........ 31
цені на вадзе ........ 32
*гром ночы тузае запыленыя струны* ........ 33
***Барбара БІРЫЛКА***
Пакута ........ 34
*Чую крык людзей* ........ 35
***Люцына ДАНІЛЮК***
*Глянь!* ........ 36
*У цішыні... ціхай ночы* ........ 37
***Мая ДАЦЭВІЧ***
Еду ........ 38
*І зноў ідзе дождж* ........ 39
***Барбара КАЗІМЯРУК***
Малітва ........ 40
Прамінанне ........ 41
***Ілона КАРПЮК***
Мы адыходзім! ........ 42
*Яшчэ ёсць сапраўдныя беларусы* ........ 43
***Анеля КЕНДЫСЬ***
Вясна ........ 44
*Здараецца, што іду лугам* ........ 45

***Ірына КУЛІК***
*Плачуць думкі* ........ 46
*Адкрываю павекі* ........ 47
***Агнешка ЛЯШУК***
Ты ........ 48
Слёзы ........ 49
***Іаанна МАСАЙЛА***
Гэта яны ........ 50
*усё, што чалавечае* ........ 51
***Ірына РАДЗІВАНЮК***
*Шукай, а знойдзеш* ........ 52
Магілкі ........ 53
***Івона РАЕЦКАЯ***
*Знайсці канец* ........ 54
Вясёлка ........ 55
***Анна САДОЎСКАЯ***
*Воск* ........ 56
*Дотык багацея* ........ 57
***Івона ЧУРАК***
*Адкрываю жылы* ........ 58
*Я трымала вакол сябе* ........ 58


## *Творчасць дарослых*


***Рэната БІЛЬМІН***
*Калі сон не прыходзіць* ........ 60
*вецер засынае* ........ 61
*Забіваю кожную думку* ........ 62
*Не кранаеш маіх далоняў* ........ 63
***Івона МАРЦІНОВІЧ***
*сказалі сёння...* ........ 64
*стаяў ахінуты смуткам* ........ 65
*са слязою... і страхам* ........ 66
*колькі патрапіла мне пад руку...* ........ 67
***Анеля МІСЯЮК***
*не ўмею кахаць людзей* ........ 68





*люстраное адбіццё ўказвае* ........ 69
*частка мяне памірае* ........ 70
***Зінаіда ЛУКША-КАВАЛЕВІЧ***
Каронны сведка ........ 71
Пара ........ 74
Думкі ў дарозе ........ 75
***Аліна ГАПУНОВІЧ***
*У вузкай далоні* ........ 76
*На месячнай поўні* ........ 77
***Славамір КУЛІК***
*па маёй душы* ........ 78
*распусціла валасы* ........ 79
***Ірына ЛУКША***
Звычайны дзень ........ 80
Мая дарога ........ 81
Сапраўднае каханне ........ 82
***Мікалай ЛУК'ЯНЮК***
Дубы ........ 83
Гора ........ 85
***Марыя МАНАХОВІЧ***
Жаўранак ........ 87
Лес зімою ........ 88
***Мікалай ПАНФІЛЮК***
Рэчка Арлянка ........ 89
Жарывец ........ 91
***Ніна ПАЦЭВІЧ***
Добры ўчынак ........ 92
***Марк РУБАШЭЎСКІ***
Дождж ........ 94
*Гаворым: каханне* ........ 95
***Уладзімір САЎЧУК***
Гутарка вясны ........ 96
*Ты абяцала мне* ........ 97
***Анна ЯКАНЮК***
Крыллі ........ 98
Нясмеласць па-сучаснаму ........ 99